





# ПАД НОВЫМІ ДАХАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Нам была пастаўлена задача дэманціраваць старую гонту. Акрамя таго, на свірне мянялі сістэму кроквaў, паколькі яна была ўжо з аварыйным ухілам, выраўноўвалі франтоны, прыбівалі новыя латы, каб асінавая трохслойная гонта трымалася надзейна і доўга, — распавядае Андрэй Канановіч.

А яшчэ кіраўнік брыгады зрабіў для мяне цікавы статыстычны экскурс: амаль чатырыста квадратных метраў складае плошча двух дахаў. Толькі на адну музейную хату пайшло шаснаццаць тысяч дошчачак. А на дах свірна гонты пойдзе ажно васямнаццаць з паловай тысяч штук. Каб пагрунтаваць два дахі, спатрэбіцца амаль сто літраў адмысловага, колеру арэха, сродку.

Нягледзячы на неадкладны рамонт даху, у музеі кожны дзень праводзяцца экскурсіі — прыязджаюць і групы, і асобныя наведвальнікі. На музейнай тэрыторыі ўжо прайшла санітарная выпілоўка старых небяспечных дрэў, падрэзка і пабелка Купалавага саду. Добраўпарадкаванне берагоў рэчкі Вязынкі і сажалкі, высаджванне кветак, забеспячэнне парадку і чысціні — штодзённы клопат работнікаў музея.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**











